# Далёкая блізкая Афрыка

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з дзяржаўным візітам у Зімбабвэ. Гэта найвышэйшы пратакольны статус візіту**

**Самалёт кіраўніка дзяржавы зрабіў пасадку ў аэрапорце сталічнага горада Харарэ ўчора ў другой палове дня. Беларускага лідара сустракаў асабіста прэзідэнт краіны Эмерсан Мнангагва.**

Рота ганаровай варты, гімны дзвюх краін, залпы з салютных установак — усё па вышэйшым разрадзе, як і належыць у адпаведнасці з пратаколам пры дзяржаўным візіце. Але было шмат і нацыянальнага каларыту. Мясцовая традыцыя — на прэзідэнтаў надзелі гірлянды з жывых кветак. А песні і танцы пад барабанную музыку адразу акунулі ў атмасферу Афрыканскага кантынента.

У аэрапорт таксама прыехала шмат мясцовых жыхароў — прыхільнікаў лідара краіны Эмерсана Мнангагвы, якія жыва віталі кіраўнікоў дзяржаў.

Аляксандр Лукашэнка і Эмерсан Мнангагва паехалі на адным аўтамабілі, на якім устаноўлены прэзідэнцкія штандары. У прагаме двухбаковых зносін на найвышэйшым узроўні ўчора была нефармальная вячэра.

Беларуская дэлегацыя пачала работу ў Харарэ яшчэ да гэтага. У першай палове дня прайшоў беларуска-зімбабвійскі бізнес-форум, дзе ўжо заключаны шэраг двухбаковых дакументаў. Дзелавыя сустрэчы і перагаворы прадоўжацца і ў дні візіту.

Афіцыйная частка перагавораў Аляксандра Лукашэнкі і Эмерсана Мнангагвы запланавана на сёння. Кіраўнікі дзяржаў сустрэнуцца ў фармаце сам-насам і ў пашыраным складзе — з удзелам членаў дэлегацый з абодвух бакоў.

З удзелам лідараў краін таксама пройдзе цырымонія перадачы тэхнікі беларускіх вытворцаў у рамках завяршэння другой фазы праграмы па механізацыі фермерскіх гаспадарак Рэспублікі Зімбабвэ і старт трэцяй фазы праграмы. Мерапрыемства пройдзе на базе Інстытута сельскай гаспадаркі Зімбабвэ.

Парламенцкі дзённік

# СВЕТАПОГЛЯДНЫ І ЮРЫДЫЧНЫ ЗМЕСТ

**Савет Рэспублікі адобрыў законапраекты аб УНС і дзейнасці палітычных аб'яднанняў**

**Падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання парламентарыямі былі адобраны законапраекты, датычныя асноў грамадзянскай супольнасці, дзейнасці палітычных і грамадскіх аб'яднанняў, а таксама Усебеларускага народнага сходу.**

**Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА** скіравала ўвагу на тое, што праект Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» шмат абмяркоўваўся з насельніцтвам у розных рэгіёнах краіны:

— Такая форма народаўладдзя, як УНС, існуе толькі ў нас, у Беларусі. Яна зарэкамендавала сябе даволі даўно — было праведзена ўжо шэсць УНС. Але цяпер, прымаючы законапраект, мы надаём УНС статус дзяржаўнага органа — найвышэйшага органа народаўладдзя. Члены Савета Рэспублікі актыўна ўключаліся ў распрацоўку, мы разглядалі праект закона на пасяджэнні экспертнага савета, абмяркоўвалі законапраект з нашымі людзьмі ў розных рэгіёнах Беларусі. Тыя падзеі, якія мы бачым, даюць зразумець: свет вельмі неспакойны. І для таго каб наша краіна развівалася і жыла паводле суверэнных ды незалежных законаў, вядома, у нас павінен быць орган улады, які дазволіць у крытычныя моманты прымаць важныя і сур'ёзныя для нашай краіны і нашага народа рашэнні.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Алег ДЗЯЧЭНКА** адзначыў, што праект «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў» накіраваны не толькі на развіццё грамадскай супольнасці, але і на стымуляванне дзейнасці палітычных партый:

— Плануецца, што ў кожнай вобласці павінна быць не менш за 100 членаў партыі, прадстаўніцтвы будуць ствараць не менш чым у адной трэці абласцей і раёнаў, уключаючы горад Мінск. Павялічваецца партыйная колькасць да 5000 членаў — гэта вельмі важна. Нам неабходна выключыць з такога працэсу партыі, якія налічваюць усяго некалькі дзясяткаў чалавек і не прадстаўляюць інтарэсы народа Беларусі. Таму змяненні будуць накіраваны на тое, каб сёння партыі больш актыўна працавалі з грамадзянскім сектарам, давалі магчымасці нашым грамадзянам рэалізаваць свае палітычныя правы і, у тым ліку, браць удзел у выбарчым працэсе.

Алег Дзячэнка дадаў, што важным новаўвядзеннем стане тое, што членамі партый могуць быць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў. Таксама забараняецца фінансаванне палітычных партый і аб'яднанняў з замежных крыніц, паколькі замежнае фінансаванне можа паўплываць на ўнутрыпалітычныя працэсы, адзначыў сенатар. У той жа час дапускаецца фінансаванне палітычных партый з боку асобных грамадзян і фізічных асоб, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь: сума ахвяравання не павінна перавышаць 1000 базавых велічынь у год.

**Член Савета Рэспублікі, старшыня РГА «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ,** каментуючы праект Закона «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», адзначыў, што ён зміяшчае як светапоглядны, так і юрыдычны аспекты:

— Светапоглядны аспект вельмі важны. Справа ў тым, што грамадзянская супольнасць у палітычнай навуцы часта ўспрымаецца як апанент дзяржаве. А бывае і як сіла, якая знаходзіцца ў жорсткім супрацьстаянні з дзяржавай. Наш закон устанаўлівае зусім іншыя прынцыпы ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадзянскай супольнасці. Гэта не апаненты і тым больш не ворагі: дзяржава і грамадзянская супольнасць — саюзнікі ў вырашэнні значных грамадскіх праблем. І задача грамадзянскай супольнасці заключаецца ў тым, каб дапамагаць дзяржаве і беларускаму народу вырашаць значныя сацыяльныя праблемы і рухацца па шляху ўзыходзячага прагрэсіўнага развіцця.

Алег Раманаў падкрэсліў, што прававы аспект законапраекта вызначаецца глыбокай выверанасцю:

— Дадзена дакладнае вызначэнне паняцця «грамадзянская супольнасць», вызначаны суб'екты грамадзянскай супольнасці і механізмы рэалізацыі дзейнасці.

Таксама падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання ў ходзе галасавання быў выбраны намеснік старшыні Савета Рэспублікі. Ім стаў Валерый Бельскі, нядаўна прызначаны членам Савета Рэспублікі кіраўніком дзяржавы. Па выніках тайнага галасавання сенатары аднагалосна падтрымалі яго кандыдатуру.

*Больш падрабязна аб прынятых законапраектах чытайце ў заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».*

# ВУЧОНЫЯ І ЖУРНАЛІСТЫ: ПРАФЕСІЙНЫ ТАНДЭМ

**Учора ў Нацыянальнай акадэміі навук былі ўшанаваны пераможцы конкурсу на найлепшае прадстаўленне навуковых дасягненняў 2022 года ў сродках масавай інфармацыі. У намінацыі «Найлепшая публікацыя» прэмію конкурсу атрымала рэдактар аддзела газеты «Звязда» Надзея НІКАЛАЕВА.**

Конкурс праводзіўся трынаццаты раз па чатырох намінацыях: «Найлепшая публікацыя», «Найлепшы сюжэт (праграма) на радыё і тэлебачанні», «Найлепшая публікацыя ў навукова-папулярным выданні» і «Найлепшае прадстаўленне дасягненняў НАН Беларусі ў сетцы Інтэрнэт».

Па кожнай з намінацый прысуджаны тры прэміі. У конкурсе маглі прымаць удзел як прафесійныя журналісты, так і непрафесійныя аўтары, папулярызатары навукі. Усяго было прадстаўлена 126 работ 38 аўтараў.

— Для таго каб данесці да грамадскасці вынікі работы нашых вучоных, надзвычай актуальна працаваць з журналістамі, мы гэта цудоўна разумеем. Дзякуй усім, хто прапагандуе беларускую навуку, і вялікая просьба да вас — працягваць гэта рабіць, — падкрэсліў падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджвання прадстаўнікоў СМІ **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Грамадству трэба ведаць, чым жыве беларуская навука. Менавіта на яе папулярызацыю і была скіравана маштабная выстаўка «Беларусь інтэлектуальная», арганізаваная па даручэнні кіраўніка дзяржавы напярэдадні Дня беларускай навукі. Там былі прадстаўлены найбольш значныя распрацоўкі за апошні перыяд. Выстаўка атрымала шырокі рэзананс, у тым ліку дзякуючы СМІ, станоўчыя водгукі, і цяпер яна будзе праходзіць у рэгіёнах. Напэўна, першым абласным цэнтрам, які падхопіць эстафету, будзе Гомель. Мы і раней праводзілі навуковыя выстаўкі, але такая маштабная, міжведамасная і дэталёва прадуманая з кластарнай арганізацыяй выстаўка прайшла ў нас упершыню.

Уладзімір Гусакоў уручыў таксама дыпломы пераможцаў конкурсу «100 маладых талентаў НАН Беларусі» і конкурсу «Топ-10 вынікаў дзейнасці акадэмічных вучоных». Штогадовы конкурс «100 маладых талентаў НАН» быў заснаваны ў 2018 годзе. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца кандыдаты навук ва ўзросце да 30 гадоў і дактары навук ва ўзросце да 40 гадоў, якія працуюць у арганізацыях НАН Беларусі. Агульная колькасць маладых вучоных, якія адначасова ўваходзяць у банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», не можа перавышаць 100 чалавек, а штогадовая колькасць лаўрэатаў конкурсу — не большая за 20 чалавек. У гэтым годзе ў банк увайшлі загадчык аддзела навукова-інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук Аляксандр Бараноўскі, навуковы супрацоўнік лабараторыі аптычнай спектраскапіі паўправаднікоў НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па матэрыялазнаўстве, кандыдат фізіка-матэматычных навук Вольга Барадаўчанка і старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі малекулярнай біятэхналогіі Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Ілья Казлоўскі.

Уладзімір Гусакоў асабліва адзначыў актуальнасць амаладжэння навуковага саставу акадэміі і выказаў пажаданне, каб маладыя даследчыкі больш актыўна абаранялі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Што датычыцца топа дасягненняў акадэмічных вучоных у галіне фундаментальнай і прыкладной навукі, то, як падкрэсліў Уладзімір Гусакоў, патрабаванні да прэтэндэнтаў (да навізны і актуальнасці заяўленых вынікаў) прад'яўляюцца вельмі жорсткія. «Мы не спяшаліся з вызначэннем пераможцаў, каб не памыліцца, — падкрэсліў ён. — У выніку было прынятае рашэнне адзначыць восем, сярод якіх і вучоныя і аўтарскія калектывы».

**Ул. інфармацыя.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пётр Павел перамог на выбарах прэзідэнта Чэхіі



Былы старшыня ваеннага камітэта НАТА Пётр Павел атрымаў перамогу ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў у Чэхіі, паведаміла агенцтва EFE. Прэм'ер-міністр Чэхіі Пётр Фіяла пацвердзіў на прэс-канферэнцыі перамогу Павела на выбарах прэзідэнта краіны. Кіраўнік урада разлічвае на актыўнае і плённае супрацоўніцтва з новым кіраўніком дзяржавы. Як паведамляла інфармацыйнае агенцтва СТК са спасылкай на Чэшскае статыстычнае ўпраўленне, Павел перамог з 58,32 % галасоў выбаршчыкаў пасля падліку галасоў з выбарчых участкаў. Яго сапернік экс-прэм'ер Чэхіі Андрэй Бабіш заручыўся галасамі 41,67 % выбаршчыкаў. Бабіш з'яўляецца лідарам цэнтрысцкага палітычнага руху ANO і цяпер узначальвае апазіцыю ў парламенце. Яўка склала 70,25 % ад агульнай колькасці з 8,25 млн выбаршчыкаў краіны з насельніцтвам каля 10,6 млн грамадзян. Як вядома, у Чэхіі прэзідэнт валодае ў асноўным цырымоніяльнымі функцыямі, аднак менавіта ён прызначае прэм'ера і членаў Цэнтральнага банка, а таксама прапануе кандыдатуры суддзяў у Канстытуцыйны суд.

### Пасольства ЗША ў Анкары папярэдзіла аб верагоднасці тэрактаў у Стамбуле



Пасольства ЗША ў Анкары выпусціла ў панядзелак абноўленае прадпісанне амерыканскім грамадзянам быць пільнымі ў сувязі з верагоднасцю тэрактаў у Турцыі. Папярэджанне размешчана на сайце пасольства, паведаміла ТАСС. «Урад ЗША папярэджвае сваіх грамадзян аб верагодных і непазбежных зваротных нападах тэрарыстаў на цэрквы, сінагогі і дыпмісіі ў Стамбуле або іншых месцах, якія часта наведваюць жыхары заходніх краін. У прыватнасці, гэта раёны [Стамбула] Беёглу, Галата, Таксім і Ісціклял», — паведаміла пасольства. Дыпмісія зазначае, што гэтае паведамленне «абнаўляе папярэджанне ад 27 студзеня 2023 года, датычнае інцыдэнтаў са спальваннем Карана ў Еўропе». Тады пасольствы ЗША і Францыі папярэджвалі аб магчымых тэрактах супраць іншаземцаў у Турцыі.

### Паліцыя паведаміла аб затрыманні больш чым 700 пратэстоўцаў у Гаазе

Паліцыя Нідэрландаў затрымала ў Гаазе больш чым 700 удзельнікаў акцыі супраць выдзялення ўрадам субсідый на здабычу нафты, газу і вугалю. Пра гэта стала вядома з распаўсюджанага ў «Твітэры» паведамлення, перадае ТАСС. Раней Rtl Nieuws пісала, што экалагічныя актывісты з групы Extinction Rebellion арганізавалі пратэст супраць субсідый вытворцам выкапнёвага паліва ў Гаазе з удзелам прыкладна 1,2 тысячы чалавек, пасля чаго паліцыя пачала эвакуіраваць пратэстоўцаў. Паводле даных Metro, экаактывісты перакрылі трасу A12, хоць мясцовыя ўлады забаранілі дадзеную акцыю, і прымацаваліся спецыяльнай канструкцыяй адзін да аднаго, арганізаваўшы пасля сядзячую забастоўку. Адзначаецца, што супрацоўнікі паліцыі папрасілі актывістаў разысціся і знайсці іншую пляцоўку для дэманстрацыі, аднак гэтая просьба была праігнаравана, пасля чаго пачаліся затрыманні.



### Падчас выбуху ў мячэці ў Пакістане загінула каля паўсотні чалавек

Па меншай меры, 47 чалавек загінулі і яшчэ каля 150 пацярпелі ў выніку выбуху ў пакістанскім горадзе Пешавар, паведаміла «Бі-бі-сі». У мясцовай паліцыі паведамілі, што на месцы здарэння знойдзены сляды ўзрыўчаткі. Пакуль дакладна невядома, ці была гэта бомба, закладзеная ў будынку, альбо выбух учыніў тэрарыст-смяротнік. У выніку здарэння частка будынка абрынулася, многія людзі апынуліся пад заваламі.